**Вернісаж.** Выстаўка «Прысвячэнне Майстру» да 120-годдзя з дня нараджэння жывапісца Івана Ахрэмчыка адкрылася ў Нацыянальнай бібліятэцы Беларусі. Экспазіцыя размясцілася ў галерэі «Перасоўная». Яе аснова — жывапісныя і графічныя работы навучэнцаў гімназіі-каледжа мастацтваў імя І. В. Ахрэмчыка. Як расказваюць арганізатары, выстаўка знаёміць гасцей з прыкладамі і вынікамі пошуку і станаўлення мастацкага амплуа навучэнцаў гімназіі-каледжа ў 1970—2020-я гады. Так, можна ўбачыць курсавыя і дыпломныя работы студэнтаў, выкананыя ў жывапісе і прысвечаныя рознай тэматыцы. Пазнаёміцца з экспазіцыяй можна да 10 верасня.